# Акцыя-віншаванне
# 100 - гадовай жыхаркі Ашмяншчыны

13 верасня валанцёры аддзялення дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" і супрацоўнікі ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна"сумесна з прадстаўнікамі органаў мясцовай улады, міліцыі, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў прынялі ўдзел у акцыі-віншаванні 100-гадовай жыхаркі Яніны Гаспараўны Вінцаловіч.

Юбілярша нарадзілася і пражыла ўсё жыццё ў вёсцы Буняны Ашмянскага раёна. Усю сваю працоўную дзейнасць працавала паляводам у родным калгасе. Галоўная радасць жыцця яе на сённяшні дзень-тры дачкі, восем унукаў, дванаццаць праўнукаў і ўжо шэсць прапраўнукаў.

Сёння шаноўная юбілярка радуецца жыццю, гасцям і пажаданням ў свой адрас!







